Крыніцай узнікнення большасці з пералічаных уласнабеларускіх выразаў з'яўляецца вуснае народнае маўленне. Так, у аснове ўзнікнення фразеалагізма *кот марцовы* 'распутнік, блуднік' ляжыць народнае назіранне над паводкамі ката ў сакавіку (устар. «у марцы»). Некаторыя ж з такіх выразаў бяруць свой пачатак у пісьмовым беларускім маўленні – беларускай мастацкай літаратуры: фразеалагізм *свінтус грандыёзус* 'ганебны чалавек, нахабнік, невук' «нарадзіўся» ў камедыі К. Крапівы «Хто смяецца апошнім», а *сена на асфальце* 'гараджанін у першым пакаленні, ахоплены настальгіяй па роднай вёсцы' – у аднайменным апавяданні М. Стральцова.

Для навучання фразеалогіі выкарыстоўваюць розныя метадычныя прыёмы. Адным з найбольш эфектыўных прыёмаў засваення ўласнабеларускіх фразеалагізмаў са значэннем асобы з'яўляецца, на нашу думку, метад этымалагічнага аналізу, які прадугледжвае знаёмства навучэнцаў з гісторыяй узнікнення таго ці іншага фразеалагізма.

Такім чынам, уласнабеларускія фразеалагізмы са значэннем асобы адлюстроўваюць спецыфіку нацыянальнай культуры, іх можна і трэба вывучаць на розных відах заняткаў па беларускай мове; найлепшым чынам гэта можна зрабіць, выкарыстоўваючы метадычны прыём этымалагічнага аналізу фразеалагічных адзінак.

Літаратура:

1. Лепешаў, І. Я. Фразеалогія сучаснай беларускай мовы : вучэб. дапам. для філал. фак. ВНУ / І. Я. Лепешаў – Мінск : Вышэйш. шк., 1998. – 271 с.

2. Лепешаў, І. Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І. Я.Лепешаў. – Мінск : БелЭн, 2004 – 448 с.

## МАСТАЦКАЯ ФУНКЦЫЯ ЭПІТЭТАЎ У ІНТЫМНАЙ ЛІРЫЦЫ АНАТОЛЯ ГРАЧАНІКАВА

**Навіцкая В. А.**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – Тарасава С. М.

Паэзія Анатоля Грачанікава з'яўляецца неад'емнай часткай і беларускай літаратуры, і непасрэдна беларускай інтымнай лірыкі. Яго вершы пра каханне – гэта своеасаблівы сплаў шчаслівых момантаў і драматычных сітуацый, пачуццяў радасці і смутку, веры і роспачы. Яны напоўнены шчырым пачуццём, душэўнасцю.

Такі шматзначны сплаў пачуццяў здольны перадаць толькі па-сапраўднаму таленавіты майстар, якому падуладныя ўсе таямніцы мастацкага слова. Стылёвую адметнасць вершаў інтымнай лірыкі А. Грачанікава ўдала

Репозиторий ГрГМУ

перадаюць сродкі мастацкай выразнасці. Праз іх мы маем магчымасць убачыць спецыфіку аўтарскага светаўспрымання, яго ацэнкі і прыярытэты, вызначыць узровень паэтычнага майстэрства.

Інтымная лірыка як асобая паэтычная сфера, што харатарызуецца асаблівым эмацыйным гучаннем, дыктуе аўтарам свае законы ў выкарыстанні паэтычных тропаў. Мова тораў пра каханне вылучаецца асаблівай выразнасцю, канцэнтраванасцю.

Запамінальны, яркі вобраз або глыбіннае пачуццё ў вершах інтымнай лірыкі ўдаецца перадаць праз эпітэт – паэтычны троп, які называюць *«одним из ведущих средств создания выразительности и воздействия в тексте, что обусловливается его изобразительными и оценочно-аксиологическими качествами»* [1, с.123]. Як правіла, у літаратурных творах ужываюцца народна-паэтычныя, метафарычныя, індывідуальна-аўтарскія эпітэты. У мастацкім тэксце большасць даследчыкаў вылучае тры асноўныя функцыі эпітэта: экспрэсіўную, ацэначную і выяўленчую.

Пры аналізе вершаў пра каханне А. Грачанікава варта адзначыць шматфункцыянальную ролю менавіта гэтага паэтычнага тропа. Заўважана, што часцей за ўсё ў інтымнай лірыцы рэалізуецца экспрэсіўная функцыя эпітэта, што дапамагае перадаць эмацыйны стан лірычнага героя, спасцігнуць гаму перажытых ім пачуццяў.

Напрыклад, экспрэсіўную функцыю паэтычны троп выконвае ў вершы паэта «Няўжо на бяду немінучую…». У гэтым творы эпітэты *«бяда немінучая»* і *«неазмрочаны час»* перадаюць адчуванні лірычнага героя, які перажыў запамінальную, але, на жаль, кароткую гісторыю кахання. *«Бяда немінучая»* – гэта нібы яго прадбачанне растання, а *«неазмрочаны час»* – успаміны самых хвалюючых сустрэч з каханай, калі яны належаць толькі адзін аднаму: «*Няўжо на бяду немінучую / Ноч спакваля аддае / Цела твае пявучае / Ў жорсткія рукі мае?/ Няўжо мы ніколі не вернемся / У той неазмрочаны час, / Калі ані здрады, ні вернасці / Не існавала для нас?»* [2, с. 89].

У гэтым жа вершы эпітэты *«жорсткія рукі»* і *«цела пявучае»* выступаюць як супрацьлеглыя паняцці. Адразу ж уяўляецца прыгожая, вытанчаная жанчына і моцны мужчына, які з сілаю, але вельмі асцярожна абараняе яе, вядзе за сабою. У многім гэты верш эратычны, сапраўды інтымны, а эпітэты, згаданыя вышэй (*«жорсткія рукі»*, *«цела пявучае»*), выконваюць не толькі экспрэсіўную, эмацыйную функцыю, але і ацэначную.

Названая функцыя эпітэта праяўляецца тады, калі аўтару неабходна перадаць свае адносіны да прадмета ці аб’екта, выказаць сваё ўспрыманне пэўных з’яў ці падзей. Напрыклад, верш А. Грачанікава «Не папракай…», напісаны ў форме звароту, дае магчымасць гаварыць пра выключна асабістае ўспрыманне лірычным героем аб’екту кахання і таго часу, які яны правялі разам. У вершы катэгарычна ставіцца пытанне: *«У чым віна мая?»*, якое надае вершу павышаны драматызм. Эпітэт у словазлучэнні «*істота святая»* пацвярджае, што лірычны герой успрымаў аб’ект свайго кахання як выключна светлую, неардынарную асобу, асабліва яму дарагую. Але, на жаль, ён сам быў *«звычайным»* і *«зямным»* для яго «незямной» каханай, таму крочыць поруч у іх

Репозиторий ГрГМУ

не атрымалася: «... *Што я, зачараваўшыся табою,/ Цябе ўяўляў істотаю святою,/ А для цябе – звычайным быў, зямным»* [3, с. 88].

Своеасаблівая роля ў інтымнай лірыцы А. Грачанікава адводзіцца эпітэтам з выяўленчай функцыяй. Большасць твораў беларускага паэта характарызуецца прысутнасцю ў іх вобразаў прыроды: рэчкі, вёскі, леса, сцяжынак і г.д., таму эпітэты дапамагаюць візуалізаваць рэчаіснасць, успрымаць яе вачыма закаханага чалавека. Каханне ў творах нібы адно цэлае з прыродай, навакольным светам: «*Вабяць азёрныя далі / Ціхай вячэрняй парой, / Дзе мы аднойчы шукалі / Папараць-кветку з табой. / Зоры з табой мы лічылі / Каля азёрнай вады…»* [3, с. 78]. У згаданым прыкладзе эпітэты канкрэтызуюць прыродны фон, узмацняюць яго рамантызаваны водсвет.

Такім чынам, праведзеныя назіранні даюць падставы канстатаваць, што ў інтымнай лірыцы А. Грачанікава дастаткова запатрабаваным паэтычным сродкам з'яўляецца эпітэт, які можна назваць поліфункцыянальным тропам. Праз эпітэт аўтар стварае эмацыйны фон у вершах, перадае адчуванні, вызначае духоўныя прыярытэты, якімі жыве яго лірычны герой. Эпітэт у вершах А. Грачанікава найбольш выяўляецца ў форме поўнага або кароткага прыметніка. Названы паэтычны троп у вершах пра каханне валодае выключнай сілай уздзеяння, робіць мастацкія вобразы, створаныя пісьменнікам, непаўторнымі і запамінальнымі.

Літаратура:

1. Булахова, Н. П. К определению понятия эпитет (предуготовление к функциональной характеристике) / Н. П. Булахова, А.П. Сковородников // Экология языка и коммуникативная практика, 2017. – № 2. – С. 122–143.

2. Грачанікаў, А. Начная змена: вершы / А. Грачанікаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1975. – 130 с.

3. Грачанікаў, А. С. Я вас люблю : Лірыка / А. Грачанікаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1986. – 143 с.

## ДА ПРАБЛЕМЫ КУЛЬТУРЫ ЗНОСІН У МЕДЫЦЫНСКАЙ СФЕРЫ

**Ермаковіч М. В., Патаповіч К. В.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – к. філал. н., дацэнт Брусевіч А. А.

Як вядома, культура зносін з'яўляецца важным элементам практычна любой прафесіі. Не будзе тут выключэннем і медыцынская сфера, паколькі паспяховае лячэнне залежыць не толькі ад прафесійнасці ўрача, але і ад яго таленту зносін з хворымі, з іх сваякамі, з калегамі.

Не лішнім будзе нагадаць, што любыя зносіны ўяўляюць сабой складаны мнагапланавы працэс устанаўлення і развіцця кантакту паміж людзьмі, якія

Рэпазіторый ГрДМУ